# Нераст ласасевых у Беларусі – пад грамадскі кантроль.

У Астравецкім раёне праходзіць акцыя экалагічных актывістаў «Захаванне ласасёвых рыбаў у рэках Беларусі». Яе мэта — дапамога дзяржаўным прыродаахоўным структурам у барацьбе з браканьерствам.

У рэках нашай краіны нерасцяцца кумжа і атлантычны ласось (сёмга) — адны з самых рэдкіх відаў рыбаў у Беларусі, нкія ўнесены ў Чырвоную кнігу (летась «Звязда» падрабязна пісала пра гэта).

З'явіўшыся з ікрынак і правёўшы пэўны час у рэках нашай краіны, маладыя рыбы «скатваюцца» ў Балтыйскае мора, каб праз некапькі гадоў вярнуцца ў свае роднын мясціны на нераст.

Цяпер дарослыя асобіны кумжы і сёмгі могуць уздымацца толькі па рацэ Віліі, хоць раней для іх міграцыі былі прыдатнымі і Нёман, і Заходняя Дзвіка, і Заходкі Буг. На шляху рыбы шмат лерашкод (плаціны, забруджанасць вады), але галоўнай, бадай, з'яўляецца браканьерства падчас нерасту. Як кажуць экалагічныя актывісты, жаданне здабыць ласося прыцягвае ў рэгіён парушальнікаў нават з іншых куткоў Беларусі. Гэта нягледзячы на тое, што памер кампенсацыі шкоды за адну асобіну кумжы ці сёмгі складае 6 базавых велічынь, а памер штрафу — ад 10 базавых велічынь. Таму назіранне за ласасёвымі рыбамі і праца па прафілактыцы і выяўленні браканьерства будзе доўжыцца да канца нерасту— да канца снежня. У гэты перыяд будуць арганізаваныя валанцёрскія лагеры ў Астравецкім раёне. Узяць удзел у іх могуць усе неабыякавыя да праблемы людзі.

**Источник:** Звязда.-2009.-19 листап.-С.7.